# Травень

**1/18. Кузьма**. Гэты прысвятак, як і многія іншыя ў календары, служыць арыенцірам для селяніна ў выкананні розных работ. «У дзень святога Кузьмы сеюць моркву і буракі» (Паўлюкоўскі, 1934). На Паазершчыне гаварылі: «Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком праводзіць» (Ляснічы, 1990). Тут таксама садзілі часнок і іншыя карняплоды. Прычым стараліся тое рабіць у поўню, бо лічылі, што ў такім выпадку гароднiна пойдзе не ў траву, а ў корань.

Назву прысвятак атрымаў з шэрагу кананізаваных імен царквою, што прыпадалі на гэты дзень, а іменна – свяціцеля Касьмы, япіскапа Халкіданскага ( у 815 – 820 ).

У еўрапейскіх краінах вялікія святкаванні наглядаліся на пачатку месяца, у той час як у Беларусі такое першамайскае свята адсутнічае, калі не лічыць афіцыйны міжнародны дзень працы і міру, што прыйшоў пазней да нас. Ёсць падстава сцвяржаць, што беларуская першамайская традыцыя, як і ў іншых, была перанесена на хрысціянскую «рухомую» Тройцу. Аб гэтым сведчаць і некаторыя прыклады з іншых краін. У раёнах Эльзаса і Латарынгіі Францыі многія абрады, звязаныя з майскім цыклам (зеленню), прымяркоўваліся да Тройцы (Pentecote) (КЗ, 1977. С. 47).

***Міраносцы**. На Смаленшчыне гаварылі: «На Міраносця п'яныі бабы цігаюць адна адну за валосця» (Дабравольскі, 1894). Жанчыны святкавалі таму, што, згодна царкоўнаму праваслаўнаму календару, трэцяя нядзеля ад Вялікадня – дзень святых жонаў Міраносіц. Такую назву мае і сталая дата ў царкоўным календары (22 ліпеня па старым стылі).

**5/22. Лялльнік**. Язычніцкае свята ў гонар багіні Лялі (Лёлі) – дачкі Лады. Маці Лада па даследаваннях вучоных , з'яўляецца багіняй вяснова-летняй урадлівасці і апякункай вяселляў. Абое належаць да рожаніц, што згадваюцца ў антыязычніцкіх сярэднявечных павучаннях.

Апісанне святкавання зрабілі ў XIX ст. фалькларысты Драўлянскі (П. Шпілеўскі, 1846) і А. Кіркор (1882), якое выглядае наступным чынам. Дзяўчаты на лузе выбіралі самую прыгожую сяброўку, апраналі ў белую кашулю, упрыгожвалі зялёнымі галінкамі, вянком з кветак і саджалі сярод малочных пачастункаў. Вадзілі каля яе карагод і спявалі:

Благаславі, маці,
Ой, Лада, маці!
Вясну заклікаці.

У іншых песнях багіня характарызуецца карміцелькай:

Дай нам жытцу
Да пшаніцу,
У агародзе –
Сенажаць,
Поўны грады,
Роўны зрады.

Пасля кожных двух радкоў выгукваецца: «Ляля, Ляля, наша Ляля!».

Багіня згадвалася не толькі ў прыпевах («Наша Ляля, Ляля нас корміць зусім...»). Ляля частавала сябровак малочнымі стравамі і кідала кожнай ў час скокаў вянкі, якія зберагаліся да наступнай вясны ці, нават, вяселля.

**6/23 Юрый (Ягорый, Юр'е-Ягор'е Частны Леса)** Даўняе земляробчае свята першага выгану кароў. Юрый (Ягорый) – апякун жывелы і земляробства, жаўнераў і гаспадар ваўкоў. Па перакананнях даследчыкаў хрысціянскі святы замяніў Ярылу, Сына Лады і Дажбога (сонца), апекуна ўрадлівасці і кахання.

Тут неабходна пагадзіцца з ёмкай і абагульняючай высновай даследчыка каляндарна-абрадавай творчасці А.Ліса (1998) «Пазней міфалагічная постаць Юр'я, змадэліраваная паводле язычніцкага светасузірання, была функцыянальна пераасэнсавана ў духу хрысціянства. У народнай свядомасці, аднак, замацоўваўся архетып, які ўзнік на раннеміфалагічным узроўні мыслення» (с. 57). У дахрысціянскую эпоху на Смаленшчыне мела яшчэ назву «Чэстной Леса». Частны леса – цар над усімі лесунамі, і ў гэты дзень яму прыносілі ахвяраванні («клалі адносы»), каб ён зберагаў жывелу ад ваўкоў. У беларусаў папярэднік Юрыя (Ягорыя) уяўляўся то ў выглядзе дзеда, то ў выглядзе белага воўка (Дабравольскі, 1914). Наогул, воўку выдзелена не малое месца ў свяце. Народныя паданні так тлумачаць узаемаадносіны Юр'я з гаспадарамі лясоў: «Як св. Юрай убіў змея, то Бог яго пазваў да й кажа:

-- Калі ты такі асілак, што пабораў такое страшэннае ўродзішча, дык я цябе настаўляю начальнікам над ваўкамі, штоб ты іх суняў, бо яны чортава тварэнне, разсвавoліліся, а мне за імі некалі паглядаць» (Пяткевіч, 1938). Да свята стараліся не выводзіць коней у начное, бо

толькі на яго «Юры ездзіць на кані, зубы ваўком замыкаець» (Шэйн, 1887). Існавала нямала звычаяў, пры дапамозе якіх стараліся аберагаць свойскую жывёлу ад ляснога гаспадара.

Пра свята гаварылі: «Да Юр'я корму і ў дурня», «Юр'ева раса – не трэба каням аўса». Статак выганялі вербнай галінкай на «юраўскую расу», шапталі замовы, абкурвалі кароў купальскімі зёлкамі . З пастухамі праводзілі абрадавыя частаванні.

Вось як апісваецца абрад «запасвання гаўяда» на Палессі, занатаваны А. Сержпутоўскім (1930) у пачатку XX ст. Гаспадар апранаецца ў святочнае, у торбу (кайстру) кладзе кавалачак хлеба, соль, «хрэшчык» (печыва, прыгатаванне на чацвертым тыдні Вялікага посту), тры каменьчыкі, сцізорык, замок, бязмен, сякеру, курынае яйка, грамнічную свечку. Зняўшы шапку выганяе з адрыны жывелу. Затым з поўным вядром вады, трыма прыгаршнямі саломы, выцягнутымі з даху амбара, па ходу сонца абходзіць «гаўядо», перакідвае праз яго камень і пырскае вадою. Зрабіўшы гэта тройчы, закапвае каля варот замок, бязмен, сякеру і яйка, распальвае на тым месцы вогнішча пераважна з саломы і прагоніць праз яго жывелу, торбу аддае пастуху. Не чакаючы заканчэння светлавога дня ўся сям'я святочна сустракае кароў і пастуха. Правяраецца ці захавалася цэлым ў зямлі яйка, якое прадвяшчае шкоднасць ці бясшкоднасць жывелы летам.

Існавалі і іншыя абрады на Беларусі. У Смаленскай губерні жанчыны надзявалі шубу мехам наверх і ў сярэдзіне стада вырывалі ў якой-небудзь жывёліны шэрсць, якую запіхвалі ў вісячы замок, каб ваўкі міналі статак. У Себежскім павеце абыходзілі жывелу, цягнучы за сабой касу.

Цікавая і арыгінальная абрадавая гульня праводзілася сярод беларусаў Смаленшчыны, зафіксаваная У. Дабравольскім (1903. С. 161-162) на мяжы XIX і XX стагоддзяў і яшчэ раней карэспандэнтам П.Шэйна (1887. С. 169) у Аршанскім павеце. Пастух загадзя вызначаў ролі сярод падпаскаў (зайца, сляпога, храмога, замка, калоды) і трайчы абыходзіў іх, што стаялі сярод статку. Паміж пастухом і выканаўцамі роляў адбываліся дыялогі накшталт наступнага:

-- Заяц, заяц, ці горкая асіна?

-- Горка.

-- Дай Бог, каб і наша скацінка для звяроў была горка!..

Падобныя адказы атрымлівае ад ўсіх. Затым удзельнікі прыступалі да рытуальнага абеду.

В.Сакалова бачыць яшчэ больш архаічны абрад, што быў запісаны ў Гродненскім і Слонімскім паветах, які заключаўся ў прагоне жывёлы праз шубу пастуха (Шэйн, 1877. С. 167). Падобнае наглядалася ў некаторых месцах Архангельскай вобласці (Сакалова, 1979. С. 167).

У Шумілінскім раёне «замочвалі» даёнкі. Коням стрыглі хвасты і грывы. Хадзілі аглядаць палі, закопвалі на ўзмежках рэшткі рытуальнай стравы (ахвяра духу зямлі), насілі на рунь каравай. Качаліся на ніве, каб зямля радзіла і давала здароў'е. На Усходнім Палессі бытаваў так званы Тураўскі карагод (гл.: Лозка А., 1989), з якім моладзь абыходзіла двары гаспадароў і кіравалася ў поле. Там насілі каравай, спявалі. У гэты дзень вадзілі і іншыя карагоды. У некаторых паўднёвых раёнах **«вадзілі стралу»** (гл.: Лозка А. 1996; 1997)**.** Вечарам спявалі Юр'еўскія песні пра тое, як Юрый адмыкае зямлю ключамі, выпускае расу і вясну:

А ўзяў ён ключы залатыя,
Адамкнуў зямлю сырусенькую,
Пусціў расу цяплюсенькую.
На Белую Русь і на ўвесь свет
*(Віцебская губ.; Шпілеўскі, 1856)*

Юр'еўскія песні спявалі да Міколы. У Гродзенскай губерні сяляне аглядалі азімыя з караваем. Качалі яго на полі. У Гомельскім павеце сярод дзяўчат быў звычай «юрыцца» (выбіралі сяброўку на ўвесь год, мяняліся хусткамі, смажылі яешню пад бярозамі). Ён нагадвае абрад «кумлення», які праводзіўся ў іншых рэгіенах на Сёмуху. Са святам звязана шмат прымавак: «На годзе ёсць два Юр'і ды абодва дурні: увосень – халодны, а ўвясну – галодны»; «Як на Юр'я пагода, то на грэчку няўрода»; «Калі на Юр'я мароз, дык сей на балоце авёс»; «Як дождж на Юр'я, то будзе хлеб і ў дурня»; «Калі прыйдзе Юры, не ўгледзіш ў жыце куры»; «Юры сказаў: «Жыта ўраджу», Мікола адказаў: «Пажджы, пагляджу».

За гады хрысціянства Юрый (Георгій) набыў асаблівую папулярнасць жаўнера. 6 траўня і адзначаецца царквою дзень вялікапакутніка Георгія Перамоганосца. Як сведчыць гісторыя, рымскі афіцэр Юрый быў пакараны смерцю ў 303 годзе імператарам Дыяклеціянам за прыхільнасць і прапаганду хрысціянства. Яго сталі называць Перамоганосцам за перамогу над пакутамі. У гонар цярпення і мужнасці Юрый атрымаў боскую ласку – быць апекуном хрысталюбівых жаўнераў. Самым вядомым цудам, якое апісана ў

царкоўнай літаратуры, выратаванне Юрыем язычніцкай прынцэсы ад цмока (змея) у возеры ля горада Вірыта. Гэтую падзею падрабязна апяваюць балады, што бытавалі і бытуюць у розных рэгіёнах Беларусі. У першым томе БНТ «Балады» змешчаны і названы варыянты 15 тэкстаў, якія ў асноўным выконваліся вясною.

Найбольш развітым і паэтычным тэкстам (50 радкоў) з'яўляецца валачобная песня пра Юрыя і цмока, запісаная ў 1968 г. на старажытнай Тураўшчыне, што пачынаецца словамі:

Як была зямля нехрышчона,
То былі людзі неверные.
Не веровалі ў госпада Бога,
Да повероваліі ў ліхога цмока.
Да давалі цмоку да на дзень оброку
По цылому чоловеку.
А як ужэ прышла пора
До самога цара –
Хочэш, сам ідзі,
А хочэш, жонку шлі...

*(Тураўскі сл., 1987)*

Розныя варыянты апісваюць па-свойму ў народнай манеры кульмінацыйны момант выратавання царэўны (каралеўны Ганускі) Юрыем-Ягорыем:

...А й плывець, плывець паганы цмок.
А й з яго ляпы агонь шыбаець,
А з яго наздзёр іскры сыплюцца.
А з яго вачэй дым трубой ідзець...
А конь з капытом, а Юр'я з кап'ём...
Абаранілі гэту Гануську,
Абаранілі каралёву дачушку...

*(Крупскі раён).*

Юрый-Ягорый – самы папулярны вобраз у беларускім фальклоры, які звязаны з гісторыяй хрысціянства. Яму прысвечаны казкі, легенды, замовы, прыказкі, абрадавыя гульні і карагоды, песні. Як справядліва заўважылі руская і беларуская даследчыкі веснавой паэзіі і абраднасці В.Сакалова (1979. С. 177) і Г.Барташэвіч (1985. С. 97), што рускі і ўкраінскі матэрыял не дадае новых сюжэтаў да зыходных беларускіх тэкстаў, іх больш было ў нас, ва ўкраінцаў меней, а ў рускіх сустракаецца на этнаграфічна беларускіх Бранскай і Смаленскай губернях.

Мусіць нездарма Георгій Перамоганосец, як вершнік, падобны на дахрысціянскага Ярылу і адлюстраванне ў гербе ВКЛ Пагоня. Нямала святыняў было пабудавана ў нас у гонар святога. Яраслаў Мудры, сын Рагнеды і князя Уладзіміра, быў хрышчоны ў Георгія і першы пачаў папулярызаваць Перамоганосца на ўсходнеславянскіх землях. Таксама вельмі папулярны хрысціянскі вялікапакутнік у Англіі, Балгарыі, Грузіі і іншых краінах.

Міфалагічнай прыродзе вобраза як беларускага Юр'я—Ягор'я, так і наогул Юрыя (Георгія), удзелена значная ўвага даследчыкамі мінулага і сучаснасці. Адны з першых аб Юрыі як Ярыле ва ўсходнеславянскіх народаў сказалі П.Ефіменка, А.Афанасьеў. Міфолаг А.Фамініцын (1884. С. 343) бачыў роднасць Юрыя з боствам сонца (бог з нябёсаў, залаты конь, Хорс), з Белбогам (Дажьбог – Ясонь – Усень, Святавіт, Радзегаст – Сварожыч), з «гавельбергскім Яравітам» і «беларускім Ярылам», «паўднёваславянскім Бронтанам (?), балтыйскімі Святавітам і Прыпекалам, вялікарускім Ярылам і мала – і беларускім Купалам», «пад імем Рая (Урая) супадае з богам багацтва і дастатку – Спарышом», «як падацель жаніхоў» з Ладам, як «волчий пастырь» (Палісун) і апякун статку з Апалонам і Марсам (Faunus – Lupercus, Silvanus) і інш.

У мусульманскіх краінах вядомы як Джырджыс, які звязаны (ці змешаны) з міфалагічным даісламскага Бліжняга Усходу.

**7/24. Алісей, Аўсей.** З немалога спіса імён, якія адзначаюцца ў гэты дзень царквою, народ «абраў» два, з якімі звязвае прысвятак пры дапамозе прыказкі: «Прыйшоў Алісей – авес пасей» (Паўлюкоўскі, 1934). Больш дакладныя тэрміны сяўбы давала народная мудрасць (гл. таксама 20 мая, 7 чэрвеня): «Сей авёс, як камары з'яўяцца», «Калі цвіце каліна – без ваганняў сей ячмень: не застанешся пакрыўджаным» (Ляснічы, 1990).

**8/25. Марк**. Хрысціянскі апостал і евангаліст Марк (I стагоддзе) стаў прыгодай для прымаўка: «Дождж на святога Марка – дык зямля, як скварка» (Паўлюкоўскі, 1934), «На святога Марка не павінна плаваць у гаршку скварка» (Федароўскі, 1935).

***Станіслаў.*** Каталіцкі каляндар стаў крыніцай для народнага прысвятка праз параду: «Сей лён на Станіслава – вырасце, як лава» (Паўлюкоўскі, 1934). Гэтай папулярнай культуры ў народзе прысвечаны і іншыя дні і нямала прыкмет.

У Польшчы існуе нямала прымавак: «Len zasiany w Stanislawa, urosnie jak trawa» -- Лён, што пасеяны на Станіслава, вырастае як трава.

«Swiesty Stanislaw len siele, Zofija konopie» -- Станіслаў сее лён, Сафія (15 траўня) каноплі (Ярмолаў, 1901. С. 263).

**Бабскія розбрыкі**. Аўторак або чацвер пасля Юр'ева дня. Рытуальны дзень скокаў жанчын, якія нібы садзейнічалі ўрадлівасці зямлі і плоднасці жывёлы. Качаліся і куляліся на ніве, падскоквалі, імітуючы рухі жывёл. Падобныя звычаі наглядаліся ў традыцыях іншых народаў.

**10/27.** Праводзіўся **абрад выезду ў поле Ярылы**. У поле выпрауляўся на белым кані малады прыгожы хлопец у белай вопратцы, такім жа плашчы-накідцы, на галаве – вянок, у руцэ – пук жытнёвых каласоў, у другой – чалавечы чэрап. Дзяўчаты вадзілі вакол яго карагод і спявалі:

Валачыўся Ярыла
Па ўсяму свету.
Полю жыта радзіў,
Людзям дзеці пладзіў.
А дзе ж ён нагою,
Там жыта капою.
А дзе ж ён не зірне,
Там колас зацвіце.
*(Драўлянскі, 1846)*

**Ярылавіца (Красная Горка).** Язычніцкае свята ў гонар вясновага культу. «На красную Горку, -- як заўважыў І. Сербаў (1911), -- «сакуны» (беларусы, што ў дзеясловах ужываюць часціцу -са замест -ся. – А.Л.) гушкаюцца на арэлях і спяваюць «Ярылавіцу і валяём»:

Валяём! Ды на вуліцы
Ярыловіца, валяём!
Ой, цяжка хлопцам –
Пятровіца.
Да судзі ж, Божа,
Пятра даждаць,
Хлеба нажаць...

Нягледзячы на тое, што ў рускіх маецца больш матэрыялу пра Ярылаў дзень, які ў іх адзначаўся 4 чэрвеня, 1 ліпеня, у Пятроўскія запускі, вядомы рускі міфолаг А.Афанасьеў пісаў, што «успаміны пра Ярылу жывей захаваліся ў Беларусі» (1865. С. 441) і, як і П.Ефіменка выказваў меркаванне ва ўсходнеславянскіх народаў святы Георгій замяніў вясенняга бога Ярылу. Гэтай думкі прытрымліваецца таксама П.Іваноў, В.Тапароў і іншыя. В.Сакалова прыйшла да вываду, што

Ярылу замяніў Купала, затым да яго быў прымеркаваны Іаан Хрысціцель (1979. С. 252). Акадэмік Б.Рыбакоў даказвае, што вобраз Ярылы аб'ядноўвае купальскую, сёмушную і русальную абраднасць, якая расцягнулася ад 4 да 30 чэрвеня (1988. С. 682).

Ярыла падобны балтыйскаму Яравіту, серба-харвацкаму Ярылу (Japulo).

Пачатак ***Пераплаўнага (Перахроснага, Чарвівага) тыдня**, чацвёртага тыдня ад Вялікадня. На Шумілінвшчыне лічаць, што нічога не трэба садзіць, бо завядуцца чэрві.

**11/28.** ***Дзень Пранціша***. У Заходняй Беларусі існавала прыкмета: 11-га мокра – усё лета мокрае, а суха – усё лета сухое (БСК, 1937).

Сярод шэрагу святых, якіх адзначае ў гэты дзень праваслаўная царква, упісана і імя святога Кірылы Тураўскага (1183 ), аднак народны каляндар не фіксуе якой-небудзь увагі да нашага слаўнага земляка.

**13/30 Якуб**. «На Якуба грэе люба» (Паўлюкоўскі, 1934), -- сцвярджае прымаўка, якой і ўводзіць у народны каляндар імя апостала Іакава (Якуба, па-простаму) Зеведзеева (44 )

Прадказвалі, якое будзе лета. Карысталіся дзедаўскімі прыкметамі: калі сонца ўзыйдзе ясна – чакаецца сухое лета, а праз хмары – дажджлівае; як ноч пад 1 траўня зорная і цёплы паўднёвы вецер – лета будзе з бурамі, але цёплае і ўраджайнае (БСК, 1937).

***Пераплаўная (Градавая, Грамавая, Палавенская) серада (Перапалавенне, Серадапосніца).** Чацвертая серада пасля Вялікадня. (Назву дала, відаць, царкоўная легенда, згодна якой у гэты дзень Божая Маці пераплывала раку.) Дзеці ўжо маглі купацца – аж да Спаса ці Іллі. У Лельчыцкім раёне не палолі , каб градам поле не пабіла; у Столінскім – баяліся, каб не заліў поле дождж; у Мазырскім -- каб не застала бура на рацэ. Дазвалялася толькі садзіць цыбулю, каб была горкай (Паўлюкоўскі, 1934).

Народная традыцыя тут мае хоць нейкую сувязь з царкоўнай. Вернікі ў гэты дзень (палавіна 50-ці дзен ад Пасхі) просяць Бога «напаіць іх душы водамі набожнасці» і здяйсняюць звычай водаасвячэння.

**14/1 Макарэй**. У некаторых мясцінах заходзілі ў раку і мачылі вочы, каб не балелі; свянцілі ваду  (Талстая, 1986).

**Ярома.** У народзе прыкмячалі: калі на Ярому непагадзь, то галодная і суровая надарыцца зіма (Ляснічы, 1990).

У праваслаўным календары – дзень свяшчэнапакутніка Макарыя, мітрапаліта Кіеўскага (пам. у 1497 г.), прарока Іярэміі (VI в. да Раства Хрыстова) і іншых.

Далёкім язычніцтвам вее ад звычаяў дня Яромы (св. Jереmѐjа, Еремиjин дан, Еремиа, Urmиjа) у народаў Югаславіі, дзе асноўным было – выгнанне змеяў, якія ўвасаблялі нячыстую сілу (Каляндарныя звычаі, 1977. С. 267). У балгараў побач з царкоўнымі назвамі свята бытуе і язычніцкае: Ирмин ден, Еремия; Зъмски ден – змяіны дзень (С. 290).

**15/2. Барыс (Барыс Скуралуп).** Лічыцца апекуном палявых работ. На Палессі праводзіліся абрады каля крыніц, вада якіх прызнавалася гаючай пры хваробах вачэй. У валачобных песнях Барыс

...ляды паліць,
Зямлю грэець, ячмень сеець
З поўнай сявенькі, з правай жменькі.
Кінеш рэдка – дасць Бог густа.
Дай жа , Божа, зарадзі, Божа,
Каласіста, ядраніста,

а таксама «па памежах ходзіць, поле дзеліць», «бабы сеець», «збожжа высіць», «бульбу засяець», «коні пасець у зялёных лугах». Раней казалі: «Як запяе ўдод, тады сей боб». На гэты дзень прымяркоўвалася «паленне грудаў», правядзенне падсечнага земляробства, падрыхтоўка так званых лядаў, для будучага поля раскарчоўвалі дзялянку і палілі груды (Нікіфароўскі, 1898)

Барыс увабраў рысы не толькі апекуна земляробства, але і жывёлагадоўлі, асабліва коней: «Сьвяты Барыс коні пасець» (з валачобнай п.), «У Барысаў дзень нельга працаваць на конях, бо такі ўстаноў дзяды здзелалі» (Шлюбскі, 1927), «Барыс – скуралуп. Халодны тыдзень. Трэба скаціне корм даваць; цяляткі дохнуць» (Дабравольскі, 1914).

У хрысціянскім календары – перанясенне мошчаў благаверных князей расійскіх Барыса і Глеба (таксама яны адзначаюцца 6 жніўня і 18 верасня). Гэта першыя рускія святыя, што былі кананізаваны Рускай і Візантыйскай царквамі. Яны ў 1015 годзе былі забіты іх старэйшым братам, князем Святаполкам, і з'яўляюцца сімвалам пакутніцтва.

Вядомы даследчык язычніцтва Б.Рыбакоў даволі пераканаўча даказвае, што на месцы дня Барыса і Глеба адзначаўся «дзень першых парасткаў». Гэтаму сведчаць як усходнеславянскія матэрыялы, так і ў большай ступені заходняй Еўропы. Майскія святы, у якіх галоўная

ўвага надавалася маладому майскаму дрэву (arbor majalis – у рымлян, Maibaum – у немцаў і г.д.), вядомы амаль усім народам Еўропы. Святы 1-2 мая праводзіліся ў гонар багіні «Maja», «Zywie» -- заключае вучоны. І гэта вядзе да глыбокай індаеўрапейскай старыны. Крытамікенскія надпісы ведаюць багіню «Ма», маці багоў, архаічную гаспадыню свету (заходнеславянскае Ziwie і старажытнарускае Дзіва, Дзівія) (Рыбакоў, 1988. С. 671-673).

**18/5. Арына Расадніца**. Дзень высаджвання расады ў Паазер'і. Калі шмат вады шло на яе паліўку, то меркавалі, што чакаецца сухі сенакос, слаба вада ўбіралася – на мокрую касавіцу (Ляснічы, 1990).

Пакутніца Ірына жыла ў I – II стагодзях.

**19/6** На Паазер'і лічылі : з раніцы вялікая раса і ясны дзень – на ўраджай гуркоў (Ляснічы, 1990).

**20/7. Антоній**. Прысвятак служыць арыенцірам у некаторых мясцінах для сяўбы аўса. «На Святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца дык і прадасца» (Гілевіч, 1983).

Антоній Марткопскі, адзін з вучняў прападобнага Іаана Зедазнійскага (VI ст., Грузія.), якому прысвечаны дзень ў царкоўным календары.

**21/8. Іван Веснавы (Іван Мікольны, Іван Доўгі, Бацька Міколы, Мікольнік).** Адзін з апекуноў земляробства. У полі з'яўляліся каласкі жыта, таму ў некаторых мясцінах гаварылі: «На Івана каласок, а на Пятра піражок» (Крачкоўскі, 1874). Спрыяльны дзень для пасеву агуркоў, морквы, рэдзькі, гарбузоў і інш. «Гуркі сеём, гарбузы, шчоб доўгіе булі, бо то ж Доўгі Іван, Іван Мікульны, перад Мікулай ходзіт» (Лельчыцкі раён; Талстая, 1986). На Віцебшчыне сажалі цыбулю (Нікіфароўскі, 1897). На Лельчыччыне сеялі агуркі пакуль каровы ляжаць у хляве, каб былі такімі тоўстымі , як жывёла, і трымалі ў руках качалку, каб раслі такімі ж вялікімі. У Пінскім павеце жанчыны ў час пасадкі вышэй падбіралі спадніцы, каб ўсё вырасла высокае, і хапаліся за сваё калена, каб агародніна была тоўстая і круглая (Булгакоўскі, 1890). На Мазыршчыне на беразе ракі раскладвалі вогнішча («купайла»), спявалі каля яго песні. Падпальвалі пукі саломы і кідалі ў плынь, каб лён добра радзіў. Там жа лічылася, што на Мікольнага Івана «орахі цвітуць і папарацы». У Ельскім раёне «купайла» рабілі з дзеркачоў і палілі, павесіўшы на хвою. Засцерагаліся ведзьмы (Талстая, 1986). Міколін бацька адлюстраваны ў калядных і валачобных песнях:

А потым таго Міколін Бацька
Із сявалачкі яр засяваець.

Первая сяўба – белы й гарошак,
Втарая сяўба – яра пшаніца,
Яра пшаніца, усякая пашніца,
Авёс вяцісты, ячмень пляцісты,
Ячмень пляцісты й, а гарох стручысты й,
Пшаніца бела ўдала была.

*(Лепельскі раён; ВП)*

Адзначаецца ў сувязі з тым, што ў гэты дзень на месце пахавання апостала і евангеліста Іаана Багаслава (96 – 117 гг.) штогод зыходзіў танчэйшы ружовы прах, які збіраўся веруючымі для лекавання.

**Мікольны тыдзень** – тыдзень перад Міколай, час пасеву агуркоў (Дэмбавіцкі, 1882).

**Ушэсце* (апісанне гл. далей)

**22/9. Мікола Веснавы (Мікола Вешні, Мікола Летні, Мікола Цёплы, Мікольшчына)**. Свята пастухоў; апякун земляробства. Аглядалі ўсходы жыта. Калі поле было плямістым, то вінаваціўся ў недародзе папярэдні апякун. «Мікола біў Барыса, што парабіў жыта лыса» (Шумілінскі раён). Як лічылі, у жыце ўжо павінна схавацца варона. У іншых раёнах наадварот асцярожныя гаспадары не выходзілі ў поле «каб сваёй прысутнасцю не збунтаваць Міколы», бо ён у гэты час сам «канчаткова вызначае, дзе будзе і дзе не будзе ўраджаю» (Нікіфароўскі, 1897). Да гэтага дня паспявалі многае пасеяць і пасадзіць – яравыя, авёс, бульбу, затым ячмень, лён, гарох, проса, каноплі. «Да Міколы не сей грэчкі, не стрыжы авечкі» (Берман, 1870). Пачыналі стрыгчы авечак, выганяць на пашу. «Юр'я пасе кароў, а Мікола коней»; «Прыпасайся сенам да Міколы, не бойся вясны ніколі». Пастухі абходзілі хаты – там іх частавалі, у полі смажылі яешню. У ноч на Міколу абкурвалі коней і валоў зёлкамі і абходзілі іх з яйцом, якое потым аддавалі сляпому старцу. Пасля такога абраду быў рытуальны абед з яешняй і гарэлкай. Яшчэ адно частаванне, якое часцей называлі Мікольшчынай, звязана з ушанаваннем абраза святога Міколы. Хадзілі ў госці адзі да аднаго, пераапраналіся ў «цыганаў», частавалі беднякоў і жабракоў.

Каб быць здаровымі, жанчыны збіралі лекавыя зёлкі і купаліся ў іх наварах. З гэтым святам звязваюць і з'яўленне камароў. У Старадарожскім раёне гавораць: «Прыйдзе Мікола – высыпле камароў з прыпола».

У валачобных песнях Мікола трохі падобны да іншых апекуноў земляробства («стары сявец ячмень сеець, засяваець», «пайшоў у поле

яравое гарох сеіць», «па межах ходзя і ўсё родзя, і траву расціць, і скот пасціць», «па бару хадзіў да раі садзіў», «коней пасціў да запасаў»).

Святы, Мікола,
Стары сявец,
Узяў сявеньку
Да й паехаў
На пашаньку.
Яр засяваіць,
Кініць рэдка –
Усходзіць густа...
*(Дзісенскі павет; РГТ, канец XIX ст.)*

Даследчыкі прыходзяць да вываду, што галоўным зааморфным папярэднікам Міколы быў Мядзведзь (Успенскі, 1982. С. 85-110), у заходнім рэгіёне – воўк (Токараў, 1957. С. 47; КЗ, 1973. С. 206).

Божы угоднік Мікола Цудатворац (І-я палова ІУ ст.) вельмі шануецца не толькі беларусамі, але і іншымі хрысціянскімі народамі. Больш святкуецца еўрапейскімі народамі зімою, 5-6 снежня.

Італьянцы гавораць: На Мікалая давай коням новае сена (Ярмолаў, 1901. С. 265). Яны ж адзначаюць 9 мая свята школьнікаў.

*Алёна, Галена*. Прысвятак звязвалі з ільном. «Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена» (Паўлюкоўскі, 1934).

**23/10. Зілот.** У некаторых раёнах сеялі пшаніцу, стараліся пасеяць каноплі. «Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злата» (Цэбрыкаў, 1862; Раманаў, 1912; Дабравольскі, 1914).

У рускіх слова «Зілот» таксама звязана з «золатам». Лічыцца, што ў гэты дзень неабходна шукаць скарбы, лекавыя зёлкі. У Польшчы таксама гавораць: «Zbieraj ziolka na przypadki, kiedu przyjdie niemoc zdradki» – Збірай зёлкі на выпадак, калі прыйдзе немач (Ярмолаў, 1901. С. 268). Хаця ў гісторыі хрысціянства асацыяцый з золатам не наглядаецца. Сімон быў сынам святога Іосіфа і адным з 12 апосталаў. Ён атрыма клічку Зілот (што зн. Змагар), за вялікую прыхільнасць да вучэння Ісуса, якое прапаведваў у многіх краінах, за што ў Абхазіі і прыняў пакутніцкую смерць і пахаваны недалёка ад Сухумі.

***Градабойцы (Ледавіты) дзень.** Пятая пятніца пасля Вялікадня. У Віленскай губерні не працавалі (Ярмолаў, 1901. С. 200).

**24/11. Макей**. Прадказвалі надвор'е на лета: «Мокра на Макея – і лета не прасушыць, а сухім Макей прышоў – і лета не намочыць» (Ляснічы, 1990). Нездарма рускія называлі дзень Царом Граду. «На

Царя Града хлеб не сей, чтобы не выбило градом» (Ярмолаў, 1901. С. 269).

**Кірыла і Мяфод**. Калі дзень мокры – і лета будзе мокрае, а як сухі – то і лета выпадзе сухое (БСК, 1939).

Царкоўны каляндар захоўвае памяць аб сяшчэнапакутніку Мокію, прасвіцеру ў Македоніі, які ў 295 годзе быў казнены ў Візантыі, і роўнаапосталах Мяфодзіі і Кірыле, пачынальніках пісьменства на старaславянскай мове (ІХ ст.)

**25/12. Епіфан.** «На Епіфан раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю – гарачае, пажаранебяспечнае лета» (Санько, 1990).

Дзень у гонар свяціцеля Епіфанія, епіскапа Кіпрскага (памёр у 403 г.)

**27/14. Сідар (Сідары).** «Прыйшлі Сідары, прыйшлі і сіверы» (Паўлюкоўскі, 1934). У народзе прыкмячалі: калі на Сідара дзьмуць паўночныя вятры, то лета чакаецца даждлівае; калі да гэтага дня ці на яго прыляцяць стрыжы і ластаўкі (касаткі) – лета надарыцца цёплае (Санько, 1990).

У царкоўным календары на гэты дзень – два Ісідора, пакутнік за веру Хрыста (ІІІ ст.), і растоўскі цудатворац (XV ст.).

У астрыйскіх каталікаў (15 мая) святы Ізідар на абразах малюецца простым селянінам з плугам, касою і цэпам і ў народных вераваннях уяўляецца абаронцам супраць засухі (КЗ, 1977. С. 173).

**28/15. Пахом.** «Святы Пахом павее цяплом» (Паўлюкоўскі, 1934), «На Пахома цёпла – усё лета будзе цёпла» (Санько, 1990). На шумілішчыне кажуць: «Сей агуркі на Пахом – будзеш насіць мяхом». Падобныя рыфмаванкі, звязаныя з агуркамі, сустракаюцца ў розных рэгіёнах Беларусі.

Прападобны Пахом Вялікі з'яўляецца заснавальнікам манашаства ў Егіпце (IV ст.)

***Ушэсце (Ушэснік, Шоснік) –** дзень агляду жыта; чацвер на шостым тыдні пасля пасхі, саракавы дзень. Як не будзе, кажуць у Лельчыцкім раёне, дажджу на Ушэсце, так не будзе шэсць нядзель (Талстая, 1984). У валачобных песнях Ушэсце (Шоснік) «колас выносіць», «у поле ходзіць, з Богам рондзіць», «пшонку сее»; у гэты дзень, як пяецца, «жыта выплываець», «жытцо пучком, каленцем», «колас точыць», «аўсы шасцяць»...

Згодна беларускім павер'ям, на Ушэсця з зямлі выходзяць прасушыцца скарбы, але іх ніхто не бачыць. З пшанічнай мукі на

малацэ з яйкамі сяляне пяклі тонкія бліны, якія называлі «богавы анучы» (Цэбрыкаў, 1862).

У многіх раёнах святкаваўся як апошні дзень вясны. А на Усходнім Палессі выконвалі абрад «ваджэння і пахавання стралы». Удзельнікі збіраліся ў традыцыйным месцы пад спевы асноўнай песні:

Ой, пушчу стралу да па ўсяму сялу.
Ой, пайшла страла, да й у канец сяла.
Да забіла страла добрага малайца...

Вадзілі веснавыя карагоды, «танок» у полі або абходзілі вакол вёскі. Гулялі на жыце, закопвалі ў глебу «стралу» (пярсцёнкі, грошы і інш.), каб задобрыць палявога духа на добры ўраджай (гл.: Лозка, 1996; 1997)

Узнясенне Гасподняе з'яўляецца двунадзесятым, г. зн. у ліку 12-ці сямейных гадавых свят. На 40-ы дзень пасля Пасхі Ісус Хрыстос «узняўся на неба» да Бацькі, каб падрыхтаваць месца для людзей.

У народаў Югаславіі свята Ушэсця нібы працягвае традыцыі Юр'я. Яго нават іншы раз называюць «святам пастухоў» і земляробства. Царкоўнае свята ў Румын таксама мае народную аснову. Яго выкарыстоўвалі для памінання продкаў і аховы людзей, жывёлы і будынкаў ад грому і злых духаў.

Калі дождж на Ушэсце, то як лічаць італьянцы (Ascena), немцы (Himmelfahrt Ghristi), французы (Ascension), будуць беды і неўраджай. Італьянцы яшчэ тлумачаць, што саломы будзе многа, а зерня мала, або яшчэ дождж будзе ісці сорак дзён (Ярмолаў, 1901. С. 290).

**29/16.** *Магдалена.* «Магдалена зязюльку прысылае» (Паўлюкоўскі, 1934), «Магдалена – вады па калена» (Сахараў, 1944), -- гавораць беларуы -- каталікі.

**31/18. Шэсць дзеў.** На Смаленшчыне гаварылі: «Лён сей позні на Шэсць дзеў» (Дабравольскі, 1897). Адну з сям'і, як на самай справе ў царкоўным календары, звалі Матрунай, таму дзень вядомы як **Канапелька Матруна**. «Канапелька Матруна ў зямлю махнула» (Дабравольскі, 1914).

**Фядот**. Да гэтага часу звычайна дубы пакрываліся зялёным маладым лісцем. Селянін прыкмячаў: «Як на дубе апушка – у Фядота поўная аўса кадушка» (Свіслацкі раён), «Прыйшоў Фядот – прынялася зямля за свой род» (Ляснічы, 1990).

Царкоўны каляндар адзначае памяць пакутніка Феадота Анкірскага і пакутніц сямі дзеў: Аляксандры, Цякусы, Клаўдзіі, Фаіны, Еўфрасіі, Матроны і Іілії (пам. у 303 г.)

**Сёмуха* *(Зялёныя святкі, Зелянец).*

***Градавая (Пераплаўная, Крывая) серада** – дзень перад Тройцай (тое самае, што і чацьвёртая серада пасля Вялікадня), лічыцца небяспечным для палявых работ. Нічога не садзілі, не палолі, каб не вырасла крывым (Булгакоўскі, 1890. С. 178).

***Сёмушныя (Траецкія, Сярэднія) Дзяды** – пятніца перад Сёмухай. «У пятніцу вараць постнэ, а ў суботу скоромнэ. На стале астаўляюць «дзядам», -- гавораць у Лельчыцкім раёне.

***Духавая субота (Старуўскія Дзяды, Стаўроўскія Дзяды, Сёмка)** – Дзяды ў суботу перад Сёмухай, Тройцай. На Вілейшчыне сяляне рыхтавалі 5 або 7 страў. Пілі з адной чаркі, пускаючы яе па крузе. Пакідалі крыху стравы і гарэлкі для «душ». У валачобных песнях зазначаецца: «Свята Тройца май стаўляць, старых памінаць» (Верхнядзвінскі раён).

У Дзісенскім павеце адзначалі Дзяды па Стаўрах і Гаўрах. Паданне сведчыць, што гэта былі сабакі славутага асілка Бая ці Буя (Дзмітрыеў, 1869).

Звычай памінання продкаў у гэты час таксама з'яўляецца язычніцкім, аб гэтым сведчыць паданне адзначэння Стаўроўскіх дзядоў і іншыя фальклорныя матэрыялы. Ён добра сумясціўся з хрысціянскай традыцыяй «памінавання ўсопшых».

Румыны адзначалі памяць продкаў і называлі дзень Mosii cei mari (Вялікія продкі) або Mosii de vara (Летнія продкі). Будынкі і вароты ўпрыгожваліся галінкамі ліпы, якія пасля таксама выкарыстоўвалі.

***Зялёная (Кляновая) субота (Зелянец, Май, Зялёныя святкі)** – свята маладой зеляніны перад Сёмухай. Варажылі пра надвор'е. Асвячалі травы, абкурвалі хаты, жывёлу, каб не баяліся перуноў.

У Магілёўскай губерні сеялі каноплі, дзяўчаты хадзілі ў лес «завіваць вянкі» (Дамбавецкі, 1882). Гаварылі: «Не Зелянец вясны канец».

Увага да зеляніны, а яна з'яўляецца дамінуючай, несуменна язычніцкая традыцыя. Асвячэнне кветак і зёлак, упрыгожванне «маем» будынкаў і памяшкання, пляценне і нашэнне вянкоў, дзявочая варажба і іншыя абрадавыя рытуалы, «завіванне бярозак» падчас «кумлення» і абрадавай ежы, прысутнасць раслiннай тэматыкі ў абрадавых песнях («Выхвалялася бярозка») – гэта сведчанні анімістычных уяўленняў нашых продкаў, што ідуць яшчэ з дахрысціянскай пары. Вядомы прымаўкі: «Да Святога духа не скідай кажуха», «На Духа будзець цёпла і суха». У гэты дзень садзілі капусту, каноплі.

***Сёмуха (Сямік, Тройца, Клечанне)** – язычніцкае свята, у якім праглядаецца культ продкаў і расліннасці, прымеркаванае пазней царквою да хрысціянскай Пяцідзесятніцы (50-ы дзень пасля Пасхі).

Упрыгожвалі «маем» будынкі. У Лельчыцкім раёне рвалі рагоз («лепеху») і клалі на падлогу, каб не было блох. Дзяўчаты хадзілі ў лес «завіваць» бярозкі, плясці вянкі, есці абрадавую страву (яйкі). На Міёршчыне спявалі:

Хадзіла Тройца каля аконца.
Я ж, маладзенькая, не выспалася...

У некаторых раёнах Палесся называлі гэтае свята Клечаннем, відаць, таму, што галінкамі клёна ўпрагожвалі хаты.

Дзень святой Тройцы, Пяцідзесятніца – вялікае царкоўнае свята, якое ўваходзіць у лік асноўных («двунадзесятых»), адно з дванаццаці, прысвечана памяці даравання Богам Маісею дзесяці запаветаў, аб спасенні святога духа на апосталаў, якія панеслі сведчанне пра ўваскросшага Ісуса. Гэты момант лічыцца нараджэннем царквы, што прызнае трыадзінства, Святую Троіцу: Бог-бацька, Бог-сын і Святы Дух.

Не складае цяжкасці заўважыць, што сёмушныя традыцыі маюць дахрысціянскае паходжанне, бо не выяўляюць у падабенстве па зместу з хрысціянскай Тройцай, хаця і ўзнікла яна як свята даволі рана - у 381 годзе, калі на царкоўным саборы ў Канстанцінопалі была прынята ў якасці асноўнага элементу сімвала веры. Найбольшае распаўсюджанне атрымала на нашых землях яшчэ пасля стагоддзя, калі была ўлючана Сяргеем Раданежскім у «рухомы» праваслаўны каляндар і ўдала злілася з сёмушнымі абрадамі і звычаямі.

Няма сумнення ў тым, што царкоўная Тройца замяніла нейкае вялікае язычніцкае свята. Югаслаўскія вучоныя уносяць меркаванне, што гэта магло быць свята Русалляў (КЗ, 1977. С. 268).

Румынская народная традыцыя сведчыць у карысць выказанай думкі. Там Тройца аб'ядноўвае дзве плыні, якія і адлюстраваны ў назвах свята: Duminika mare (Вялікая нядзеля) і Rusalii. Хаця Русаліі адзначаюцца як і ў нас на наступны дзень. Маецца падобнасць у традыцыях і назвах сняткаванняў народаў Еўропы: Духове, Тројице, Тројичин дан, Руса е, Руса и, Пресвета – сербы, чарнагорцы; Дуовден, Светатроица – македонцы; Duhovi, Trojaki, Rusalije, Rusalju -- харваты; Binkosti, Trjaki, Risali, Risalski svetki – славенцы; Русална, Русалијска або Русана недела – сербы, чарнагорцы; Духовска, Русана, Мртва або Пресветска субота.

Албанскія традыцыі Русіцаў звязаны з кветкамі і культам продкаў. Таксама праводзілася рытуальная  трапеза і даўняя цырымонія «пахавання маці сонца» ў выглядзе глінянай фігуркі чалавека (КЗ, 1978. С. 261).

Пачатак * **Русальнага (Граннага, Крывога, Праводнага, Клячальнага, Траецкага, Духавага) тыдня (Русальніца, Брэзжыны, Іван-дыМар'я, Духаў дзень)** – наступны тыдзень пасля Сёмухі; дні праводзін вясны. Ушаноўваўся культ раслiннасці і продкаў. Іван-ды-Мар'я называюць у Рэчыцкім раёне панядзелак Русальнага тыдня.

Звычайна на другі дзень Сёмухі на Піншчыне некалі наладжвалі свята Куста, або вадзілі «куста». «Апраналі» дзяўчыну ў зялёныя галінкі дрэў і вялі па вёсцы з песнямі:

Павядзём куста пад гай зеляненькі,
Сустрэне нас да казак маладзенькі...

*(Быкоўскі, 1878)*

Прывялі куста
Ды й из зялёнага клёну:
Дай нам, пану,
Хоч па залатому...

*(Булгакоўскі, 1890)*

Абрады і песні былі накіраваны на садзейнічанне ўрадлівасці зямлі і лепшай долі чалавека.

Ва Усходнім Палессі выконваліся праводзіны русалкі ў жыта. Найбольш вядомы з абрадаў песні у Чачэрскім і Буда-Кашалёўскім раёнах:

На Граннай нядзеле
Русалкі сядзелі...

У Хойніцкім, Рэчыцкім і іншых раёнах спявалі:

Правяду я русалачку да броду,
А сама вярнуся да дому...

На Веткаўшчыне ў гэтыя дні не садзілі кваткух на яйкі, каб не вадзіліся кураняты з крывымі нагамі (Раманаў, 1912). На Смаленшчыне, на Брэзжчыны не сеялі яравыя (Дабравольскі, 1914).

У Рэчыцкім раёне была зафіксавана танцавальная гульня з «макатрамі». Хлопцы-танцоўшчыкі трымалі на палках «макатры» (хладышы), у якіх разбівалася дно ў час танца, затым свабоднымі палкамі разбівалі і вялікі «макацёр», што быў надзеты на галаве хлопчыка ў жаночай вопратцы (Макарцоў, 1994. С. 27).

Панядзелак Святога Духа – дзень пасля Пяцідзесятніцы, царкоўнае свята Святога Духа, які, згодна біблейскіх уяўленняў, праяўляецца ў людзях, асвячаючы іх, а гэта і з'яўляецца галоўнай мэтай стварэння і выратавання свету.

Акадэмік Б.Рыбакоў (1988. С. 681) заўважае, што Русаллі з'яўляюцца агульнаславянскім, а можа нават, і агульнаеўрапейскім, аграрным святам, звязаным з урадлівасцю палёў, маленнямі аб дажджу і нараджэнні новых каласкоў. І гэта праяўляецца ў блізкасці абрадаў і святкаванняў Сёмухі, Тройцы, Купалля ў русальным чэрвеньскім месяцы. У іх відавочна вылучаецца культ вады, раслінаасці, урадлівасці і пладавітасці. Даследчык вылучае наступныя звычаі і абрады: скокі дзяўчат, карагоды вакол бярозкі, пляценне і кіданне ў ваду вянкоў, песні аб яравой пшаніцы і будучым ураджаі, імітацыя coitus'а, звяртанне да русалак, Лады, Лелі, Туру і Ярылы, ахвяры вадзе ў выглядзе жаночых лялек, пахаванні мужчынскіх лялек і інш. Што датычыць асаблівасці русальных песень ва ўсходніх славян, то тут справядліва заўважыла фалькларыст Г.Барташэвіч, што эпіцэнтрам іх бытавання з'яўляецца руска-беларуска-ўкраінскае ўзмежжа, пры тым што песенная творчасць найбольш пашырана ў беларусаў, вядома ўкраінцам і сустракаецца ў сумежных з Беларуссю раёнах у рускіх (1985. С. 154).

Звычаі, звязанныя з зелянню, праводзіліся ў Францыі, Германіі і іншых краінах на 1 мая. Ёю ўпрыгожвалі плошчы, дарылі адзін аднаму. Таксама як і ў нас на Заходнім Палессі, быў падобны звычай на «ваджэнне куста» – майская каралева і нявеста, прыгажуня мая, або проста май. Звычайна ў абрадзе галоўны персанаж упрыгожаны галінкамі і лісткамі, выконваўся дзецьмі. У некаторых вёсках Бургундзіі і Савойі дзіцячыя працэсіі ладзіліся ў першую нядзелю мая. «Майская нявеста» (I'Epouse de mai) упрыгожвалася кветкамі яблыні і баярышніка, у руках трымала букеты маргарытак і роз. Ля парога кожнай хаты дзеці спявалі песні з пажаданнямі і прасілі падарункі (КЗ, 1977. С.45-46).

Працэсіі дзяўчат з «троіцкай нявестай» (Pinkster Bruid) у Нідэрландах праводзіліся ў аўторак Тройцы (с. 85). У Германіі майскую нявесту называюць Pfingstbraut, там жа ў некаторых рэгіёнах у панядзелак вадзілі маску вадзяной птушкі, існавала нямала іншых забаў (с. 158-159). Народы Югаславіі правадзілі ў двары вёскі шэсці (kraljice, kraljevi, kralji, kraljicari, lelje – харваты; кра ице, руса е, русалка – сербы) з кралыцай, упрыгожанай кветкамі і іншым, у

суправаджэнні музыкаў, дзе славілі гаспадароў (с. 269). У румын гэты дзень быў поўнасцю язычніцкім. Існавалі і цікавыя русальныя абрады і павер'і.

Албанцы Русіцы, свята кветак і культа продкаў, адзначалі праз 25 дзён пасля Пасхі.

***Конскі Вялікдзень** – першы аўторак пасля Сёмухі, свята коней. У гэты дзень не выкарыстоўвалі іх для работы, у канюшні ставілі свечку за здароўе жывёлы (Булгакоўскі, 1890. С. 179-180).

Конскім Вялікаднём (Конски Вялигдан) сербы, чарнагорцы і македонцы называлі суботу першага тыдня Вялікага посту. Гэты дзень лічыўся святам жывёлы, асабліва коней (КЗ, 1977. С. 253).

***Градабой (Градавая серада, серада Русаль)** – серада на Гранным тыдні; засцерагаліся ад граду. У Мазырскім раёне гаварылі: «Эта ж яе трэба сільна сьвяткаваць, каб гран не йшоў. Як яе не сьвяткуюць, дак град рабіцьме ў сяле ўрэда, збівае дабро. У полі не работалі, каб град не збіваў» (Талстая, 1984). «У сераду Русаль на балоце Вялікая Гала палешукі звычайна цэлай грамадой выходзяць за сяло і са спевамі здабываюць з ясеня свяшчэнны агонь» (Пінскі павет; Сербаў, 1915).

На Валожыншчыне адзначалася «Пастушковае свята», пастухі наладжвалі «балёк». А ў ваколіцах Тыкоціна і Бельска валоўе або конскае «вяселле». Хлопцы забаўляліся тым, што прыладжвалі на спіну вала балвана-рыцара з усім ваярскім рыштункам, зробленым з прыроднага матэрыялу. Калі напалоханы вол скідаў «рыцара», святкаванне пераносілася ў карчму.

У характары правядзення Градавай серады, асабліва серады Русаль, праяўляюцца сляды шанавання даўняга культу Перуна.

***Наўскі (Намскі) чацвер (Наўская Тройца)** – чацвер пасля Тройцы, памінальны дзень продкаў на могілках. Нічога не рабілі, бо лічыўся «сухім» днём. Аблівалі адзён аднаго вадою, каб не было засухі (Раманаў, 1912. С. 203). На Століншчыне і цяпер нясуць «на могліцы аір, по-нашэму, панны, і ліпу затыкаюць на крэсты»; у Бярозаўскім раёне «ідуць гуляты воны по жытовы. А потым ужэ ідуць воны на кладбішча і із сэбэ одэжу пэрэтрушваюць» (Талстая, 1986).

У рускіх папярэдні чацвер, які называўся Сяліком, быў кульмінацыйным у Троічным цыкле з цэнтральным персанажам – бярозкай.

***Абліваха** – чацвер на Гранным тыдні. У Добрушскім раёне бліваліся вадою, каб ішоў дождж.

***Розыгры (Русальчыны розыгры)** – апошні дзень Русальнага тыдня. Засцерагаліся, каб русалка не «зашчыкатала» чалавека. «Русалкі тыждзень гуляюць, па жыту бегаюць, да косы распушчаны, а ў панядзелок розойдуцца, то кажуць: розыгры» (Тураўскі сл., 1985). У Лельчыцкім раёне зазначаюць: «На Розыгры палолі лён, коб вон іграў. У лён не ўлезе русалка, бо свечоны. А просо не трэба палоць».

***Пятроўскія запускі** – наступная нядзеля пасля Сёмухі, пярэдадзень Пятроўскага посту. Хадзілі «развіваць вянкі», якія звівалі ў Зялёную суботу. Спявалі песні (Дамбавецкі, 1882).

***Пятроўка (Петравіца)** – Пятроўскі пост (праз тыдзень пасля Сёмухі ў панядзелак і да 11 ліпеня).

У Ельскім раёне гаворaць: «Летам у Петроўку весілля не робяць... Петроўка-голодоўка, потому што старый хліб поелі, а нового не нажалі», у Лельчыцкім: «Петроўка сушыць болота, а Спасоўка – рэкі» (Талстая, 1996). На Смаленшчыне некалі казалі: «У Пятроўку Бог блюдзе рагожкі, а ў шубе вошкі» (Дабравольскі, 1814). Усюды пара сенакосу. «Хто ў Пятроўку сена не косіць, той зімой у сабак прасіць» (Рэчыцкі павет; Пяткевіч, 1938).